ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 22 (261) | Субота, 18 чэрвеня 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень. | Цана 2 кап.

**ЗАЎТРА— 19-га ЧЭРВЕНЯ ВЫБАРЫ Ў МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ.**

**АДНАДУШНА ПРАГАЛАСУЕМ ЗА НАРОДНЫХ ВЫБРАННІКАЎ!**

## ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

## АБ ВЫБРАННІ ТАВАРЫША БРЭЖНЕВА Л. І. СТАРШЫНЁЙ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Выбраць таварыша Брэжнева Леаніда Ільіча Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
С. НІЯЗБЕКАЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль
16 чэрвеня 1977 г.

## АБ ПЛЕНУМЕ ЦК КПБ

У Мінску 10 чэрвеня адбыўся чарговы, VI пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Пленум ЦК КПБ абмеркаваў пытанне «Аб праекце Канстытуцыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і задачах партыйных арганізацый рэспублікі, якія вынікаюць з даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі таварыша Л. І. Брэжнева і рашэнняў майскага 1977 г.) Пленума ЦК КПСС,

З дакладам выступіў другі сакратар ЦК Кампартыі Беларусі А. Н. Аксёнаў.

З заключным словам выступіў другі сакратар ЦК Кампартыі Беларусі А. Н. Аксёнаў.

Па абмеркаванаму пытанню пленум ЦК КПБ прыняў пастанову.

Пленум ЦК Кампартыі Беларусі, выражаючы волю камуністаў, усіх працоўных рэспублікі, аднадушна адобрыў праект Канстытуцыі СССР, прыняў да няўхільнага кіраўніцтва і выканання рашэнні майскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, палажэнні і вывады, змешчаныя ў дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева.

Удзельнікі пленума ЦК КПБ з вялікім уздымам накіравалі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Леаніду Ільічу Брэжневу.

## АБ ПЛЕНУМЕ ГОМЕЛЬСКАГА АБКОМА КПБ

Адбыўся чарговы, VI пленум Гомельскага абласнога камітэта Кампартыі Беларусі.

Пленум абкома КПБ абмеркаваў пытанне «Аб праекце Канстытуцыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і задачах партыйных арганізацый вобласці, што вынікаюць з даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Канстытуцыйнай камісіі таварыша Л. І. Брэжнева і рашэнняў майскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС».

З дакладам на пленуме выступіў першы сакратар абкома Кампартыі Беларусі В. А. ГВОЗДЗЕЎ.

Па абмеркаванаму пытанню пленум абкома КПБ прыняў адпаведную пастанову.

Пленум абкома КПБ аднадушна адобрыў праект Канстытуцыі СССР, прыняў да няўхільнага кіраўніцтва і выканання рашэнні майскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, палажэнні і вывады, змешчаныя ў дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева.

Удзельнікі пленума абкома КПБ з вялікім уздымам прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Л. І. Брэжневу.

*Зацверджаны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 мая 1977 года*

## Гимн Союза Советских Социалистических Республик

Текст С. Михалкова и Г. Эль-Регистана — Музыка А. В. Александрова.

Союз нерушимый республик свободных
Сплотила навеки Великая Русь.
Да здравствует созданный волей народов
Единый, могучий Советский Союз!
Славься, Отечество наше свободное,
Дружбы народов надежный оплот!
Партия Ленина — сила народная
Нас к торжеству коммунизма ведет!
Сквозь грозы сияло нам солнце свободы,
И Ленин великий нам путь озарил:
На правое дело он поднял народы,
На труд и на подвиги нас вдохновил!
Славься, Отечество наше свободное,
Дружбы народов надежный оплот!
Партия Ленина — сила народная
Нас к торжеству коммунизма ведет!
В победе бессмертных идей коммунизма
Мы видим грядущее нашей страны,
И Красному знамени славной Отчизны
Мы будем всегда беззаветно верны!
Славься, Отечество наше свободное,
Дружбы народов надежный оплот!
Партия Ленина — сила народная
Нас к торжеству коммунизма ведет!

25-ГА ЧЭРВЕНЯ — УСЕСАЮЗНЫ КАМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЕЖНЫ СУБОТНІК

## ПАПРАЦУЕМ ПА-УДАРНАМУ

Летам 1978 года ў сталіцы Кубы — Гаване адбудзецца XI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Ён пройдзе пад дэвізам «За антыімперыялістычную салідарнасць, мір і дружбу» і з'явіцца важнейшай падзеяй у міжнародным маладзёжным руху, у развіцці супрацоўніцтва яго розных палітычных сіл на антыімперыялістычнай аснове. Фестываль закліканы пацвердзіць жыццёвую магутнасць сусветнага фестывальнага руху, яго непарыўную сувязь з барацьбой шырокіх грамадскіх сіл за мір, міжнародную бяспеку, дэмакратыю і грамадскі прагрэс.

Ленінскі камсамол праводзіць вялікую работу па падрыхтоўцы да XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.

VII пленум ЦК ВЛКСМ прыняў рашэнне аб правядзенні 25 чэрвеня 1977 года, напярэдадні Дня савецкай моладзі, Усесаюзнага камсамольска-маладзёжнага суботніка, заробленыя сродкі ад якога пералічыць у фонд фестывалю.

Дзень 25 чэрвеня павінен стаць яркім святам ударнай працы для ўсіх членаў ВЛКСМ і савецкай моладзі. Ён паслужыць яшчэ адной праверкай іх вернасці прынцыпам пралетарскага інтэрнацыяналізму, дастойнага ўкладу кожнага маладога чалавека Краіны Саветаў у падрыхтоўку XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў на Кубе.

Камсамольцы нашага ўніверсітэта, нягледзячы на гарачую пару экзаменацыйнай сесіі, таксама прымуць у суботніку самы актыўны ўдзел. Яны будуць заняты на ўдарнай камсамольскай будоўлі — будаўніцтве новага корпуса вытворчага абутковага аб'яднання «Праца» і на іншых пускавых аб'ектах.

Студэнты ГДУ выйдуць на суботнік з пачуццём вялікага задавальнення за сваю сацыялістычную Айчыну, якое выклікана рашэннямі майскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, яркай прамовай на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, вынесеным на ўсенароднае абмеркаванне праектам новай Канстытуцыі СССР. Яны папрацуюць так, каб радавалася сэрца ад унесенага ўкладу ў фонд XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які праз год будзе вітаць на сваёй зямлі гераічны народ вострава Свабоды.

**М. БЕРАЗОЎСКАЯ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце.**

## ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ Ў ФІЗКУЛЬТУРЫ І СПОРЦЕ!

*Гомельскай вобласці ўручан пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў СССР*

13 чэрвеня ў Доме палітасветы абкома партыі адбыўся сход партыйна-гаспадарчага актыву вобласці.

Сход адкрыў першы сакратар абкома КП Беларусі В. А. Гвоздзеў.

Аднадушна выбіраецца ганаровы прэзідыум сходу ў саставе Палітбюро ЦК КПСС на чале з Генеральным сакратаром ЦК тав. Л. І. Брэжневым.

Даклад «Аб стане і мерах па далейшаму развіццю фізічнай культуры і спорту ў святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС» зрабіў сакратар абласнога камітэта партыі С. П. Бабыр.

Перад удзельнікамі сходу выступіў першы намеснік старшыні Камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР В. П. Захавін. Ён уручыў прадстаўнікам працоўных вобласці і спартыўнай грамадскасці пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў СССР, якім яна ўзнагароджана за поспехі, дасягнутыя ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве на лепшую пастаноўку фізкультурна-масавай і спартыўнай работы ў 1976 годзе.

Словы ўдзячнасці Камуністычнай партыі і Савецкаму ўраду за вялікія клопаты аб развіцці фізкультуры і спорту, за высокую ўзнагароду выказаў старшыня абласнога спорткамітэта В. П. Пуцькоў.

На сходзе выступіў першы сакратар абкома КПБ В. А. Гвоздзеў. Сход прыняў адпаведную пастанову.

У рабоце сходу партыйна-гаспадарчага актыву прынялі ўдзел старшыня аблвыканкома Ю. М. Хусаінаў, старшыня Камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР, Герой Савецкага Саюза В. І. Лівенцаў, загадчык сектара аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПБ П. У. Піляк, сакратар Белсаўпрофа С. А. Аржаўкін, члены бюро абкома КПБ І. А. Белагуб, Я. Я. Савасценка, У. С. Сцяпук, В. М. Якаўлеў, а таксама намеснік старшыні аблвыканкома Я. Д. Летачэўскі, адказныя работнікі абкома КПБ і аблвыканкома.

Група спартсменаў і актывістаў фізічнай культуры і спорту вобласці была ўзнагароджана Ганаровымі граматамі абкома КПБ і аблвыканкома, каштоўнымі падарункамі.

* * *

14 чэрвеня раніцай наш універсітэт наведалі першы сакратар абкома КПБ В. А. Гвоздзеў, сакратар абласнога камітэта партыі С. П. Бабыр, першы сакратар гарадскога камітэта партыі В. М. Якаўлеў, першы намеснік старшыні Камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР В. П. Захавін, старшыня Камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР, Герой Савецкага Саюза В. І. Лівенцаў, загадчык сектара аддзела адміністрацыйных органаў ЦК КПБ П. У. Піляк, сакратар Белсаўпрофа С. А. Аржаўкін, намеснік старшыні аблвыканкома Я. Д. Летачэўскі, старшыня абласнога спорткамітэта В. П. Пуцькоў. У рэктараце адбылася гутарка аб стане і развіцці фізкультуры і спорту ва ўніверсітэце. З інфармацыяй выступіў дэкан факультэта фізічнага выхавання Б. М. Зайцаў. У ходзе гутаркі абмеркаваны пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай спецыялістаў фізічнай культуры.

